# Палепшыць работу органаў сувязі

* * *

**К. КІСЯЛЕЎ,**

**намеснік Старшыні Совета Народных Камісараў Беларускай ССР**

Адступаючы пад ударамі доблеснай Чырвонай Арміі, нямецка-фашысцкія акупанты паляць і разбураюць на сваім шляху ўсё, што толькі ім сустракаецца: заводы, фабрыкі, чыгуначныя станцыі, МТС, калгасы, соўгасы, сялянскія хаты і г. д. З асаблівай лютасцю і стараннасцю яны разбураюць сродкі сувязі.

На долю калектыва работнікаў сувязі БССР выпала пачэсная і адказная задача — хутчэй аднавіць усе віды сувязі ў вызваленых раёнах рэспублікі.

Работнікі сувязі ў вызваленых раёнах БССР выканалі вялікую работу па аднаўленню сувязі.

Але ці можам мы сказаць, што работа сувязі наладжана і знаходзіцца на належнай вышыні? На жаль, не. Неабходна прама сказаць, што сувязь, у тым ліку паштовая, на сённяшні дзень працуе вельмі нездавальняюча. Да гэтага часу работнікі сувязі не выконваюць патрабаванняў урада БССР. Упаўнаважаны Наркамата сувязі СССР па БССР тав. Краўчук неаднаразова абяцаў наладзіць работу сувязі, але датуль абяцанні застаюцца на словах.

Тэлеграф, тэлефон і пошта працуюць нездавальняюча

Часта работнікі сувязі спасылаюцца на тэхнічныя непаладкі зношанасць апаратуры, а таксама нястачу яе. Безумоўна, гэта мае месца, але справа заключаецца ў тым, што наяўнае абсталяванне выкарыстоўваецца няправільна, нядбайна. Якасць работы асобных работнікаў сувязі стаіць на надзвычай нізкім узроўні. Многія работнікі не ведаюць правілаў тэхнічнай эксплаатацыі

Адсутнічае работа па павышэнню кваліфікацыі кадраў, нягледзячы на тое, што 70 процантаў іх упершыню працуе ў органах сувязі.

Дрэнна праводзіцца тэхмінімум. Вопытныя работнікі не дапамагаюць малавопытным работнікам сувязі.

На тэлеграфе і тэлефоннай станцыі адсутнічае адпаведная дысцыпліна. Ёсць выпадкі грубага абыходжання з абанентамі. Устаноўлены факты, калі тэлеграмы важнейшага характару ляжаць на тэлеграфе па некалькі дзён.

Не арганізаваны кантроль праходжання карэспандэнцыі да раённага цэнтра, калгаса і соўгаса. Дастаўка газет, як правіла, спазняецца на некалькі дзён. Пісьмы дастаўляюцца грамадзянам з вялікім спазненнем, ёсць нават выпадкі, калі іх губляюць пісьманосцы.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі***